чением в туристическую карту региона. Целесообразно сопровождение данных маршрутов современными формами репрезентации: театрализованными экскурсиями, анимационными программами, квестами, виртуальными экскурсиями и др. Мероприятия, проводимые на базе кластера, будут также востребованы посетителями агроусадеб и участниками веломаршрутов, проходящих по территории района.


1. *Морозов, В. Ф.* Стили и направления в архитектуре Беларуси второй половины XVIII – первой половины XIX века / В. Ф. Морозов. – Минск : БНТУ, 2016. – 239 с.

2. Развитие туризма, деятельность туристических организаций, средств размещения Республики Беларусь за 2021 год / Статистический бюллетень. – Минск, 2022. – 42 с.

3. *Семенюга, Татьяна.* Тышкевичи. Строители дворцов и дипломаты / Т. Семенюга // Планета. – 2021. – № 12 (200). – С. 26–33.

4. Управление по образованию, спорту и туризму Воложинского райисполкома [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://volozhin-edu.gov.by/. – Дата доступа: 01.04.2022.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

УДК 069.5:737.1(476.1)


**І. Н. Колабава,**

*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», Мінск*


## ЗНАХОДКІ МАНЕТ І МАНЕТНЫХ СКАРБАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ ВАЛОЖЫНСКАГА РАЁНА МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

У артыкуле разглядаецца актуальнае для развіцця рэгіянальнага краязнаўства пытанне аб знаходках манет і манетных скарбаў на тэрыторыі Валожынскага раёна Мінскай вобласці.

**Ключавыя словы**: Валожынскі раён, тапаграфія манетных скарбаў, музейныя нумізматычныя калекцыі, функцыі грошай.

**I. Kolabava,**
*Candidate of Historical Studies, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Historical and Cultural Heritage of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk*

## DISCOVERY OF COINS AND COIN TREASURES ON THE TERRITORY OF VALOZHYN DISTRICT OF MINSK REGION

The article considers the issue of finding coins and coin treasures on the territory of Valozhyn district of Minsk region, which is relevant for the development of the studies in regional lore.

**Key words**: Valozhyn district, topography of coin treasures, museum numismatic collections, money functions.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вывучэнне гісторыі любога рэгіёна Беларусі немагчыма без звароту да праблем грашовага абарачэння. Манеты і манетныя скарбы як аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны ўтрымліваюць аб'ёмную інфармацыю эканамічнага, палітычнага і сацыяльнага характару, сведчаць аб узроўні тэхнічнага і культурнага развіцця грамадства.

Грашовы скарб (комплекс манет ці папяровых грошай) з'яўляецца прыкладам самага звычайнага і шыракараспаўсюджанага спосабу захоўвання каштоўнасцей сярод прадстаўнікоў розных слаёў насельніцтва. Манетныя дэпазіты з'яўляюцца своеасаблівымі рэгулятарамі грашовага абарачэння, таму што на нейкі час вымаюць з рынкавага абарачэння ў рэзерв залішнія грашовыя сумы, якія пры неабходнасці вяртаюцца назад і ўключаюцца ў працэс куплі-продажу тавараў.

Геаграфічнае становішча беларускіх зямель і гістарычныя падзеі абумовілі стракаты, «шматнацыянальны» склад грашовых дэпазітаў, якія часам, у сілу розных жыццёвых абставін, заставаліся на доўгія часы ў сваіх сховішчах.

Рэгулярная рэгістрацыя знойдзеных на беларусікіх землях грашовых дэпазітаў пачалася ў XIX ст. На тэрыторыі Беларусі, пачынаючы з гэтага часу, зафіксавана адкрыццё больш за 1,5 тыс. грашовых скарбаў, частка з якіх знаходзіцца ў музеях краіны.

Першасная класіфікацыя скарбаў падзяляе іх на грашовыя і грашова-рэчавыя. У далейшым скарб можа быць аднесены, для

прыкладу, да групы страчаных, зваротных (захаваных з намерам іх выкарыстання ў будучым), культавых ахвяраванняў, дэпазітаў кароткатэрміновага накаплення, надзвычайных абставін і інш. Час захавання скарбу ўмоўна звязваюць з годам чаканкі наймалодшай манеты з яго складу. Зразумела, што больш дакладнае датаванне павінна ўлічваць шэраг дадатковых момантаў (напрыклад, пры адсутнасці прытоку больш позніх эмісій, пэўныя манеты маглі прысутнічаць у абарачэнні даволі доўгі час пасля іх выпуску).

На тэрыторыі Валожынскага раёна, па наяўных даных, навукова зафіксавана 9 выпадкаў знаходжання асобных манет і скарбаў, якія ахопліваюць перыяд з X па канец XVIII ст.

Першымі рэальнымі грашыма, якія выконвалі ў жыцці тагачаснага насельніцтва беларускіх зямель усе функцыі грошай (мера вартасці, сродак абмену, сродак плацяжу, сродак накаплення, сусветныя грошы), сталі дзірхамы – срэбныя манеты Арабскага халіфата, якія актыўна ўдзельнічалі ў грашовым абарачэнні ў перыяд IX–X стст.

У 1955 г. на левым беразе р. Бярэзіна, у в. Пагарэльшчына быў знойдзены ўнікальны грашова-рэчавы скарб куфічных дзірхамаў, захаваны ў 910-я гг.

Манетная частка была прадстаўлена куфічнымі дзірхамамі, датаванымі VIII – пачаткам X ст. (265 цэлых і фрагментаваных экзэмпляраў), і іх перайманнямі, а таксама манетавіднымі нарыхтоўкамі ў метралагічных нормах дзірхамаў (усё разам – 1904 экз.) халіфаў Умаядаў і Абасідаў, эмірскіх родаў Саманідаў, Сафарыдаў і інш., чаканеных на манетных дварах Закаўказзя і Цэнтральнай Азіі [2, с. 120].

Даследаванне скарбу было праведзена вядомымі польскім і беларускім нумізматамі М. Чапкевічавай і В. Рабцэвічам. Сярод перайманняў куфічных дзірхамаў былі выяўлены аднаштэмпельныя ўзоры з аналагічнымі манетамі са скарбу, знойдзенага на тэрыторыі Польшчы ў в. Клюкавічы [1, с. 125].

Рэчавая частка Пагарэльшчыцкага скарбу была прадстаўлена срэбнай шыйнай грыўняй (прыблізна 1/2 яе частка) і «двумя бунтами серебряной проволоки [скручанай у спіраль. – *І. К.* ] со следами обрубки по краям» [4, с. 224, № 49]. Скарб захоўваўся ў металічным начынні – бронзавым кацялку з двума вушкамі, прычым захавалася толькі прываранная да корпуса частка аднаго з іх.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дэпазіт быў перададзены на захоўванне і вызначэнне ў Нумізматычны кабінет БДУ. Але ў далейшым, 12.04.1997 г., Нумізматычны кабінет быў абрабаваны. Ахвярай стаў і цалкам вызначаны Пагарэльшчыцкі скарб, ад якога засталося толькі 69 манет, 3 срэбраныя вырабы і кацялок [3, с. 120; 5, с. 6].

У XIV–XV стст. у грашовым абарачэнні Вялікага Княства Літоўскага разгортваецца перыяд пражскага гроша. Асноўным манетным наміналам становіцца агульнапрыняты ў еўрапейскіх краінах пражскі грош – вялікая срэбная (білонная) манета, чаканеная на манетным двары ў мястэчку Кутна Гора. Прыйшла гэта манета і на тэрыторыю Валожынскага раёна. У 1963 г. у в. Лоск (у гэты час в. Лоск уваходзіла ў склад Маладзечанскага раёна) быў адкрыты скарб пражскіх грошаў [2, с. 131, № 18]. На жаль, з гэтага дэпазіту вядома толькі адна манета – грош Вацлава IV (1378–1419).

Перыяд другой паловы XVII – канца XVIII ст. характарызуецца прысутнасцю ў грашовым абарачэнні Беларусі шырокага спектра разнастайных грашовых адзінак практычна ўсіх еўрапейскіх краін. Адпаведна і манетныя скарбы гэтага перыяду ўтрымліваюць стракатыя наборы грашовых сродкаў.

У 1959 г. у в. Драбяні сп. І. Унукоўскім на гл. 0,2–0,3 м быў знойдзены грашовы скарб 3-й чвэрці XVII ст. Манеты, загорнутыя ў тканіну, былі змешчаны ў глінянае начынне. Захаваліся фрагменты начыння, кавалкі тканіны і 1517 манет: Рэч Паспалітая (тэрнарый, грош, 1,5 гроша, паўгрош, соліды), Прусія (соліды), Швецыя (трайны грош, соліды), Шатландыя (двайны пенс). Скарб паступіў на захоўванне ў Беларускі дзяржаўны музей [4, с. 385, № 447].

У 1898 г. ва ўрочышчы Нівы каля в. Мінцоў Ашмянскага пав. быў адкрыты скарб срэбных (1 ф., 2 зал., 72 дол., ці акруглена – 421, 2 г) і білонных (61 зал., 54 дол., ці акруглена – 262,6 г) манет 3-й чвэрці XVII ст.: Рэч Паспалітая (соліды, 1,5 гроша, шасціграшовікі, грошы), Прусія (соліды), Швецыя (соліды) [4, с. 385, № 446].

Даведка : 1 фунт /409,5124 г/ = 96 залатнікам = 9216 долям.

У 1960 г. у в. Шапавалы ў невялікім скураным мяшочку быў знойдзены манетны скарб, з якога захавалася 310 манет: Рэч Паспалітая (шасціграшовікі), Гішпанскія Нідэрланды (чвэрці патагонаў, паўпатагон, патагон), Прусія (шасціграшовікі). Скарб датуецца 3-й чвэрцю XVIII ст. [4, с. 473–474, № 787].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1894 г. у в. Кражын Ашмянскага пав. быў адкрыты грашовы скарб масай у 6 ф. 29 зал. (акруглена – 2 кг 581 г): Рэч Паспалітая (шасціграшовікі, орт, трыццаціграшовік), Расія (рубель), Прусія (шасціграшовік), Гішпанскія Нідэрланды (чвэрць патагона). Скарб датуецца 4-й чвэрцю XVIII ст. [4, с. 482, № 821].

У пісьмовых крыніцах засталіся звесткі і аб недатаваных грашовых скарбах невядомага складу.

У 1883 г. у маёнтку Кацолы каля в. Дубіна Ашмянскага пав. быў знойдзены скарб залатых і срэбных манет «с изображением на некоторых из них польских королей» [4, с. 506, № 945].

У 1884 г. у в. Заафільцы Ашмянскага пав. таксама адкрылі скарб залатых і срэбных манет [4, с. 506, № 946].

Складальнік «Археологической карты Виленской губернии» Ф. В. Пакроўскі (1893) паведамляў аб тым, што ў в. Вялікае Запрудзе Ашмянскага пав. «лет сорок тому назад найден чугунный котелок с золотыми монетами» [4, с. 506, № 947].

Захаваліся звесткі, што ў архіве сектара археалогіі Інстытута гісторыі НАН Беларусі знаходзіцца ліст настаўніцы Забродскай школы Валожынскага раёна М. П. Цітовай ад 08.05.1955 г. з просьбай вызначыць 2 прыкладаемыя манеты са скарбу, знойдзенага калгаснікам Яблонскім у в. Студзянец. Манеты на наш час страчаныя [4, с. 506, № 948].

У выніку можна адзначыць, што манеты і манетныя скарбы, адкрытыя на тэрыторыі Валожынскага раёна, фрагментарна адлюстроўваюць манетны фонд, якім карысталася насельніцтва беларускіх зямель у розныя перыяды гісторыі грашовага абарачэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

1. *Колобова, И.* Клады в собрании Нумизматического кабинета Белорусского государственного университета / И. Колобова // Rozwój muzealnictwa i kolekcjonerstwa numizmatycznego – dawnej i dzis – na Białorusi, Litwie, w Polsce i Ukrainie. Materiały z II Międzynarodowej Konferencji Numizmatycznej. Supraśl, 5–7 IX 1996. – Warszawa, 1997. – S. 125–126.

2. *Рябцевич, В. Н.* К вопросу о денежном обращении западнорусских земель в XIV–XV вв. / В. Н. Рябцевич // Нумизматика и сфрагистика. – Киев, 1965. – Т. 2. – С. 121–134.

3. Рябцевич, В. Монетные депозиты западных земель Древней Руси (материалы) / В. Рябцевич // Światowit : rocznik poświęcony archeologii

przeddziejowej i badaniom pierwotnej kultury polskiej i słowiańskiej – 2006/2008. – № 7 (48)/B. – C. 107–137.
4. *Рябцевич, В. Н.* Топография монетных кладов Белоруссии : дис. … канд. ист. наук / В. Н. Рябцевич. – Ленинград, 1965. – 600 с.
5. Скарбы Нумізматычнага кабінета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта / уклад.: В. Сідаровіч, А. Плавінскі. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2014. – 20 с.: іл.

УДК 001.891.32:316.7Ядвігін Ш.

**Т. Ф. Сухоцкая,**
*кандыдат культуралогіі, дацэнт, дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск*

**Л. А. Андрэева,**
*студэнтка 302 групы факультэта сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск*

# З ВЕРАЙ У СВЕТЛЫ ІДЭАЛ АДРАДЖЭННЯ

Духоўная спадчына Ядвігіна Ш. разглядаецца не толькі ў кантэксце культуры нацыянальнага адраджэння пачатку XX ст., але паказваецца актуальнасць праблематыкі яго твораў для сучаснага беларускага грамадства. Падкрэсліваецца скіраванасць яго творчасці на адраджэнскія ідэалы, якія выкрышталізоўваліся ў асяродку маладой нацыянальнай інтэлігенцыі, знаходзілі сваё выяўленне ў мастацкіх тэкстах пісьменніка. Паказваецца адметнасць стылю Ядвігіна Ш., асновай якога стала гарманічнае спалучэнне сэнсаў народнай культуры, яе маральна-эстэтычных ідэалаў са стылёвымі напрамкамі імпрэсіянізму, сімвалізму і экспрэсіянізму. Адзначаецца разнастайнасць формаў мастацкай творчасці пісьменніка, у якіх ён здолеў актуалізаваць патэнцыял беларускай гутарковай стылістыкі – байка, анекдот, лірычная імпрэсія, відзяжы, жыціе, філасофская навела, прыпавесць, раман. Падкрэсліваецца асветніцкая парадыгма духоўнай спадчыны Ядвігіна Ш., яе сувязь з адраджэнскімі інтэнцыямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ